# Літаратуразнаўства

Л. К. ТАРАСЮК

## БЕЛАРУСКАЯ ПАЭЗІЯ ПАЧАТКУ XX ст. Ў АЦЭНКАХ А. НАВІНЫ (ЛУЦКЕВІЧА)

Творчая спадчына Антона Луцкевіча — вядомага грамадскага дзеяча, творцы ідэй нацыянальнага адраджэння і дзяржаўнасці Беларусі, аднаго з кіраўнікоў БНР, таленавітага публіцыста і літаратурнага крытыка— патрабуе не толькі ўсебаковага і аб'ектыўнага навуковага аналізу, але не ў меншай ступені маральных адносін. Маральны аспект вывучэння спадчыны нядаўна рэабілітаванага (1989 г.) грамадскага і культурнага дзеяча палягае ў аднаўленні аўтарства ягоных ідэй у пазнейшых працах па гісторыі беларускай літаратуры. Гэтая праблема паўстае і ў дачыненні да такіх жа рэпрэсіраваных сучаснікаў А. Луцкевіча — В. Ластоўскага, М. Гарэцкага, ступень запазычанасці з гісторыка-літаратурных даследаванняў якіх у працах іх наступнікаў недапушчальная з пункту гледжання навуковай этыкі. Тым не менш у спадчыне Антона Навіны (А. Луцкевіча) заставалася яшчэ шмат арыгінальных ідэй, трапных назіранняў і ацэнак літаратурнага працэсу, не запатрабаваных артадаксальнай навукай, паколькі яны не ўпісваліся ў сістэму выпрацаваных у ёй ідэалагем і эстэтычных каардынат.

Да прыкладу, прымалася ідэя эвалюцыі Я. Купалы ў сацыяльна-тэматычным аспекце яго паэзіі — ад песняра сацыяльнай крыўды беларускага мужыка да выказніка пратэсту, змагарнай волі народа. І пры гэтым калі не адкідвалася, то затушоўвалася галоўнае, што сфармуляваў А. Навіна ўжо ў загалоўку свайго артыкула-лекцыі: «Янка Купала як прарок адраджэння». Больш дакладна ніхто з сучаснікаў Я. Купалы не акрэсліў галоўную ідэю, сэнс купалавай творчасці.

Гэтую ідэю А. Навіна вылучае, падкрэслівае пастаянна, бадай, у кожнай сваёй працы пра Я. Купалу: у тых змястоўных артыкулах пра паэта, што ўвайшлі ў кнігі літаратурнай крытыкі «Нашы песняры» (1918) і «Адбітае жыццё» (1929), у аглядных і праблемных артыкулах «Пуцяводныя ідэі беларускае літаратуры» (1921), «Галоўныя кірункі ў беларускай паэзіі» (1933). Аналіз творчасці Я. Купалы як «прарока беларускага адраджэння» грунтаваўся ў працах А. Навіны пераважна на тых купалаўскіх творах, што пазней, у савецкай рэчаіснасці, хаваліся-перахоўваліся ад народа ў спецсховах, што па смерці паэта не перадрукоўваліся менавіта з-за іх магутнага адраджэнскага пафасу — як паэма-балада «На Куццю». І ўсё ж не асобныя творы Я. Купалы, а ўся яго мастацкая спадчына ў цэлым, разуменне маштабнасці таленту паэта, усведамленне яго споўненай пясняркай місіі пабуджала даследчыка асэнсоўваць творчасць свайго вялікага сучасніка як з'яву эпахальнага значэння. «Сілай свайго таленту ён так жыва, так праўдзіва і так па-мастацку малюе поўню нашага нацыянальнага жыцця ва ўсіх яго мінулых і сучасных праявах. Ён сягае і да пацямнеўшых ужо і зацёртых абразоў князёў і вояў старадаўных, і да нявычарпанай крыніцы народнае паэзіі. Багацце адценкаў у Купалы — незвычайнае. У яго асобе найбольш

поўна выявіліся ўсе тыя думкі і ідэалы, якія творыць працэс адраджэння нашага народу»[1].

Майстэрства публіцыста, уменне вылучыць грамадскае значэнне літаратурнай з'явы спадарожнічала, але не замінала эстэтычнаму аналізу твораў у артыкулах і рэцэнзіях А. Навіны. Не збіваючыся на публіцыстычнасць, на дэкларатыўнасць тону, крытык кіруецца найперш эстэтычным пачуццём, шукаючы ў мастацкім слове паэта здзейсненую красу. Невыпадкова ў артыкуле «Напевы ліры Янкі Купалы» як лейтматыў гучыць менавіта ідэя красы, бо праз красу беларускага паэтычнага слова і сцвярджае Я. Купала, паводле А. Навіны, сваю адраджэнскую місію: «...ужо настаў час дзеля магутнага размаху ў тварэнні **красы**, харства»; «...усё нашае нацыянальнае сілай творчага таленту Купала падымае на вышыню агульналюдскага разумення, знаходзячы ў ім і адбіраючы цэннасці агульналюдскае вагі. Гэта перадусім — вялікая **краса** й дух волі...»; «**Краса** — той супольны язык народаў, які іх звязвае ў вадну сям'ю. І гэтым языком прамовіў Купала на ўвесь свет —ад імя Беларускага Народу!»[2] (падкрэслена намі — Л. Т.).

А. Навіна развівае плённую думку М. Багдановіча, тэзісна выказаную ў артыкуле «За тры гады», аб характары мастацкай эвалюцыі Я. Купалы. Аналіз паэзіі Я. Купалы ў працах А. Навіны вызначаецца глыбінёй і змястоўнасцю, эстэтычным густам і зайздросным адчуваннем літаратурных кантэкстаў. У гэтых ацэнках змяшчалася цэлая праграма даследавання творчасці Я. Купалы — дасюль, на жаль, не рэалізаваная як след па асобных яе кірунках, ва ўсякім разе ў сувязях з тагачаснымі мастацкімі плынямі еўрапейскай паэзіі.

Новыя для беларускага літаратуразнаўства перспектывы можна вызначыць паводле характарыстыкі літаратурнага працэсу пачатку XX ст., што даецца ў артыкуле А. Навіны «Галоўныя кірункі ў беларускай паэзіі»: «Супрацоўніцтва ў «Нашай ніве», злучаючы маладых аўтараў на грунце адраджэнскае ідэалогіі, зусім не зацірала індывідуальных рысаў і ўласцівасцяў кожнага з іх і не вытварыла нейкага адзінага з фармальнага боку літаратурнага цячэння. І ў сям'і «нашаніўцаў» дужа добра ўжываліся побач прадстаўнікі народніцкага натуралізму і рамантызму, рацыяналізму і містыцызму, пралетарскай барацьбы і эстэтызму, канчаючы разнароднымі плынямі неарамантызму»[3].

Нават пэўная тэрміналагічная адвольнасць гэтых азначэнняў не змяншае вартасці агульнай характарыстыкі літаратурнага развіцця ў «нашаніўскую» эпоху. Услед за М. Багдановічам і Я. Купалам, якія ў сваіх артыкулах адзначалі эстэтычную «рухавасць» тагачаснай беларускай літаратуры, А. Навіна выводзіць даследчыцкую думку на сутнасна-мастацкія праблемы літаратурнага развіцця, якіх беларускае савецкае літаратуразнаўства асцерагалася. У выніку ідэалагічных засцярогаў на працягу многіх дзесяцігоддзяў фарміраваўся аднабаковы погляд на літаратурны працэс у Беларусі пачатку XX ст., калі літаратура разглядалася амаль выключна як выказніца сацыяльных запатрабаванняў грамадства, а сэнс мастацкіх пошукаў зводзіўся да рэалізму і фалькларызму. Самая праблема мастацкіх плыняў, якую спрабаваў пазначыць А. Навіна, у савецкім літаратуразнаўстве проста не бралася ў разлік, хоць менавіта ў ёй палягае сэнс літаратурнага развіцця.

Пад «народніцкім натуралізмам», паводле вызначэння А. Навіны, трэба разумець найбольш распаўсюджаны і трывалы ў практыцы «нашаніўскага» перыяду рэалістычны кірунак, прычым часта ў сваёй першасна-наіўнай форме фактаграфіі жыцця пры даволі аднастайным эмацыянальным выяўленні. У пазнейшых літаратурна-крытычных працах, у тым ліку і самога А. Навіны, гэта кірунак набыў устойлівае азначэнне «нашаніўскі». Між тым у межах «нашаніўства» як грамадска-культурнай практыкі нацыянальнага адраджэння не існавала эстэтычнай аднастайнасці, што і падкрэсліваў А. Навіна ў літаратуразнаўчым нарысе «Галоўныя кірункі ў беларускай паэзіі». На жаль, акрамя праблемы рамантызму (у дачыненні да творчасці Я. Купалы), праблема іншых мастацкіх плыняў, умоўна пазначаных А. Навінам, амаль не паўставала ў далейшым аб'ектам літаратуразнаўчага аналізу.

Сам жа А. Навіна найбольшую ўвагу надаваў «эстэтызму», як ён акрэслівае адметнасць творчасці М. Багдановіча. Гэтай праблеме прысвечаны артыкул А. Навіны «Праблемы красы й мастацтва ў творах Максіма Багдановіча», у аснову якога пакладзена яго рэцэнзія ў «Нашай ніве» на кнігу «Вянок». Творчасць М. Багдановіча называецца тут паэзіяй «чыстае красы», дзе «чыстая краса» выступае як эстэтычная сутнасць мастацтва па-за ўсякімі карыслівымі, утылітарна-практычнымі і нават высакародна-грамадзянскімі мэтамі творчасці. А. Навіну пасля дакаралі за нібыта супрацьпастаўленне М. Багдановіча дэмакратычнай беларускай літаратуры з яе ідэаламі служэння народу. Беспадстаўнасць такіх закідаў відавочная, калі зыходзіць з сэнсу выказванняў самога крытыка: «Грамадскія матывы, заклікі, ідэалы могуць складаць *змест* мастацкага творства, могуць служыць магутным *пабуджэннем* да тварэння, але н е  м о г у ц ь  д ы к т а в а ц ь  с в а і х  з а к о н а ў у *красе*. І мастацтва, якое — маючы перад сабой тыя ці іншыя грамадскія мэты—забылася б хоць на адзін мамэнт аб тым, што істотай яго з'яўляецца буджэнне *эстэтычнае эмоцыі*, такое мастацтва ўтраціла б адразу і ўвесь свой сэнс, і сваю чарадзейную сілу, што прымушае мацней біцца сэрцы людскія, і сваю ўладу над душамі»[4]. Не сцвярджэнне эстэтычнай канфрантацыі М. Багдановіча з яго сучаснікамі, а разуменне яго мастацкага феномена як сапраўднага здабытку беларускай літаратуры — пафас артыкулаў А. Навіны пра выдатнага паэта. Самое ж паняцце «чыстая краса», пры ўсёй яго дыскусійнасці, не з'яўляецца вынікам нейкіх эстэтычных «завіхрэнняў» беларускага крытыка, — яно добра вядомае сусветнай эстэтычнай думцы, прысутнічае ў філасофіі мастацтва І. Канта. Такім чынам, беларускаму літаратуразнаўству трэба не «абараняць» М. Багдановіча ад «міфаў» А. Навіны, а разглядаць яго творчасць у шырокім агульнаеўрапейскім эстэтычным кантэксце.

Даволі спрэчнай, аднак, уяўляецца думка А. Навіны аб тыпалогіі талентаў Багдановіча і Сальеры (паводле эпісталы Багдановіча «Ліст да Ластоўскага»). Як ні парадаксальна, але гэтую ідэю сучасныя навукоўцы падтрымлівалі, звяртаючы ўвагу на багдановічаўскія характарыстыкі творчага працэсу Сальеры і не заўважаючы пэўнай палемічнасці, шматсэнсавасці гэтых характарыстык. Выказваючы правa творцы на ўдасканаленне свайго таленту, на «штодзённы, рупны труд» мастака, М. Багдановіч не абсалютызуе рацыянальны пачатак творчасці і называе талент Сальеры «халодным». А халоднае рамяство заўсёды будзе зайздросціць жывому агню геніяльнага натхнення, ствараючы розныя маральныя калізіі. На жаль, А. Навіна не паглыбляўся ў багаты змест багдановічаўскага твора, а ягоныя назіранні над гэтым вершам набывалі пазней неадпаведныя зместу твора інтэрпрэтацыі ў даследчыкаў і аматараў паэзіі М. Багдановіча.

Сур'ёзную палеміку з А. Навінам пры яго жыцці вёў Адам Станкевіч, турбуючыся пра паэтычную спадчыну Казіміра Сваяка. Як каталіцкі святар А. Станкевіч не мог пагадзіцца са свецкай трактоўкай некаторых паэтычных ідэй пісьменніка-ксяндза. На яго думку, А. Навіна не ўлічвае складаны духоўна-рэлігійны ракурс вершаў К. Сваяка і адвольна тлумачыць матывы нявер'я ў «помач Божую» ў справе адраджэння Беларусі ледзь не атэістычнымі поглядамі аўтара. Безумоўна, у пазіцыі А. Навіны магла быць пэўная доля вульгарызацыі (з пункту гледжання рэлігіі) духоўнага зместу паэзіі К. Сваяка, аднак жа ў аналізе паэзіі як мастацтва слова крытык кіруецца логікай мастацкіх вобразаў, а не з'явамі пазалітаратурнага характару. Да таго ж матывы нявер'я, трагічных сумненняў чалавечага духу сапраўды ўласцівыя лірыцы Сваяка, што падкрэсліваў адначасова з Навінам Уладзімір Самойла.

Пэўная палемічнасць артыкулаў і рэцэнзій А. Навіны была праявай адметнага даследчыцкага таленту, самастойнасці творчай асобы крытыка. Выступаючы побач з М. Багдановічам, В. Ластоўскім, М. Гарэцкім, У. Самойлам, ён адыграў адну з вядучых роляў у станаўленні прафесійнай беларускай крытыкі, у арганізацыі самога літаратурнага працэсу, асабліва ў перыяд «Нашай нівы». Ягоная кніга «Нашы песняры» (1918)

запачаткавала сабой літаратурную крытыку як самастойную галіну літаратуразнаўства. Нарысы А. Навіны аб творчасці Ядвігіна Ш., Я. Коласа, Я. Купалы, Ц. Гартнага, М. Багдановіча, А. Пашкевіч (Цёткі), К. Буйло, З. Бядулі, дапоўненыя затым артыкуламі пра М. Гарэцкага і маладыя таленты 20-х гадоў — Н. Арсенневу, У. Дубоўку, М. Чарота, У. Жылку, — а таксама шэрагам аглядных і праблемных артыкулаў, што друкаваліся ў 20—30-я гады, — складаюць аснову калі не сённяшняга, то будучага беларускага літаратуразнаўства.

[1] Навіна А. Пуцяводныя ідэі беларускае літаратуры. Вільня, 1921. С. 26—27.
[2] Навіна А. Адбітае жыццё. Вільня, 1929. С. 56, 58.
[3] Навіна А. Галоўныя кірункі ў беларускай паэзіі. Вільня, 1933. С. 9.
[4] Навіна А. Адбітае жыццё. С. 74.

М. М. ХМЯЛЬНІЦКІ

## АПАВЯДАЛЬНІК У ВЕРШАВАНЫХ ГАВЭНДАХ АДАМА ПЛУГА

Творчасць Адама Плуга (сапраўднае імя і прозвішча Антоні Пяткевіч), польскага і беларускага пісьменніка 19 ст., — з'ява цікавая як для польскага, так і для беларускага прыгожага пісьменства. Яго паэтычныя і празаічныя творы, публіцыстычная дзейнасць яшчэ не атрымалі досыць належнага крытычнага асэнсавання[1]. Для беларускай літаратуры Адам Плуг прыцягальны тым, што нарадзіўся на Беларусі, знаходзіўся ў цесным кантакце з беларускамоўным асяродкам Вільні, Мінска, сам спрабаваў пісаць на роднай яму мове[2], уводзіў актыўна ў тэкст беларускія рэаліі, а для польскай ён цікавы тым, што, як правільна заўважыў у сваёй кнізе «Падарожжа ў 19 стагоддзе» літаратуразнаўца А. Мальдзіс, «раманы і аповесці Плуга ў многім падрыхтавалі глебу для прозы польскага крытычнага рэалізму другой паловы 19 стагоддзя»[3], што пісьменнік быў непасрэдным удзельнікам грамадска-літаратурнага руху на Польшчы. Акрамя таго, творчасць Адама Плуга, разам з літаратурнай спадчынай У. Сыракомлі, Я. Чачота, Я. Баршчэўскага, уяўляе сабой даволі значны пласт у прыгожым пісьменстве беларуска-польскага памежжа мінулага стагоддзя (які, дарэчы, яшчэ не зусім добра вывучаны).

Адам Плуг з'яўляецца прадстаўніком гетэрагеннай літаратуры, літаратуры сумежжа, што жывілася беларускім нацыянальным космасам, а знаходзіла выяўленне на іншамоўнай аснове. Тым больш цікавы аб'ект даследавання. Разгляд творчай спадчыны Плуга неабходны і па той прычыне, што ён у нейкай ступені «падсвечвае» агульны фон гісторыка-літаратурнага працэсу, які адбываўся на тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай. Але, гаворачы словамі даследчыка беларуска-польскага ўзаемадзеяння ў 19 ст. У. Мархеля, «нельга выпускаць з поля зроку і тое, што польскамоўныя творы пісьменнікаў Беларусі хоць і былі рэгіянальнай з'явай, але суіснавалі з творамі пісьменнікаў Польшчы, далучаючыся тым самым да развіцця ўласна польскай літаратуры. Гэта з аднаго боку, а з другога — польскамоўныя творы «беларускага» паходжання, уліваючыся ў польскую літаратуру і становячыся польскім нацыянальным здабыткам, выяўлялі ў сабе не так правінцыяльныя рысы, як прыкметы самастойнага мастацкага асэнсавання рэгіянальнай беларускай рэчаіснасці»[4].

За імем Адама Плуга ў польскім літаратуразнаўстве неяк трывала замацавалася меркаванне як аб пісьменніку другарадным, творчасць якога ў большасці сваёй з'яўляецца эпігонскай, прамым наследаваннем твораў А. Міцкевіча. Такі погляд прасочваецца, напрыклад, у артыкуле польскага крытыка І. Мацієўскай «Літаратурны вобраз Адама Плуга»[5]. Але, на нашу думку, гэтая выснова грунтуецца на павярхоўным аналізе